# Пра якасць — з душой

**Работа рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" заваявала спецыяльны прыз у чэлленджы (відэаконкурсе) "Беларуская якасць — традыцыі, працавітасць, тэхналогіі".**




Узнагароду дырэктару РВУ «Культура і мастацтва» Наталлі Кузняцовай уручыў старшыня агульнага сходу акцыянераў ЗАТ "Патио" Андрэй Балабін. Справа — старшыня Дзяржстандарту Рэспублікі Беларусь Алена Маргунова

## 1 МАШТАБНЫ ПРАЕКТ

Арганізатарам творчага спаборніцтва, прымеркаванага да пяцігодкі якасці, выступіў Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь.

Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і прызёраў адбылася 24 сакавіка ў канферэнц-зале БелДІСС.

Конкурс аб'яднаў флагманаў прамысловасці, установы аховы здароўя, адукацыі, культуры і іншых сфер, сродкі масавай інфармацыі. З 276 заявак строгі адбор прайшлі 260 работ, якія і былі прадстаўлены на суд грамадскасці і журы ў афіцыйным тэлеграм-канале арганізатара.

Вітаючы фіналістаў, старшыня Дзяржстандарту Рэспублікі Беларусь **Алена Маргунова** адзначыла:

— Галоўная мэта праекта — паказаць шматграннасць паняцця "якасць": гэта не толькі характарыстыкі прадукцыі, але і ўсё, што нас акружае. Падобныя ініцыятывы выхоўваюць усвядомленае стаўленне да сваёй працы і дазваляюць прызнаць заслугі кожнага.

Паводле слоў Алены Маргуновай, членам конкурснай камісіі, у якую ўваходзілі прадстаўнікі міністэрстваў, грамадскіх арганізацый, бізнес-саюзаў і іншыя спецыялісты, выбраць найлепшых было няпроста: узровень крэатыўнасці ўдзельнікаў аказаўся па-сапраўднаму высокім.



Падчас здымак працкта ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі

## 2 КАМАНДНЫ ВЫНІК

Наша рэдакцыя вызначылася ў намінацыі "Адлюстраванне якасці ў культуры і мастацтве". Пра тое, як ствараўся ролік-пераможца, расказала дырэктар установы **Наталля Кузняцова**:

— Гэта вынік вялікай каманднай працы. Адразу пасля аб'яўлення чэленджу мы стварылі "творчую лабараторыю", дзе выпрацоўвалі канцэпцыю. Ідэя аформілася хутка: імкнуліся паказаць, з якіх элементаў складаецца якасць у духоўнай сферы.

Геаграфія здымачных пляцовак была шырокай: стаяла задача адлюстраваць розныя кірункі працы работнікаў сферы. Мы ўдзячны ўсім установам культуры, якія адгукнуліся на прапанову і дапамаглі з арганізацыяй працэсу: Вялікаму тэатру Беларусі, Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальнаму мастацкаму музею Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Беларускай дзяржаўнай філармоніі і Маладзёжнаму беларуска-расійскаму сімфанічнаму аркестру, Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў, Лагойскаму раённаму Дому рамёстваў. Менавіта гэтае партнёрства дазволіла стварыць глыбокі і эстэтычны відэашэраг.

## 3 ВЫБАР ГЛЕДАЧОЎ

Адмысловай узнагародай для рэдакцыі стала падтрымка інтэрнэт-аўдыторыі. Дзякуючы актыўнасці тысяч падпісчыкаў работа нашай установы ўвайшла ў топ-3 у намінацыі "Выбар падпісчыкаў".

— Ад душы дзякуем кожнаму, хто аддаў свой голас падчас правядзення народнага галасавання, за добрае стаўленне і веру ў нас, — сказала Наталля Кузняцова.

Спецпрыз ад генеральнага спонсара чэленджу (ЗАТ "Патио") — ноўтбук — стане важным сродкам у далейшай рабоце рэдакцыі па папулярызацыі беларускай якасці — праз праекты і артыкулы ў газеце "Культура" і часопісе "Мастацтва", а таксама па прасоўванні нацыянальных культурных і духоўных каштоўнасцей у інтэрнэт-прасторы.

**Святлана ЧЭКАЛАВА**
Фота аўтара і Уладзіміра ШЛАПАКА



Работы канкурсантаў атрымалі высокую ацэнку членаў камісіі і гледачоў